УДК 947.6«15/16»+[340.134+340.136+340.153]:342.541([476+474.5]–89)«15/16»

# СИСТЕМАТИЗАЦИЯ ПРАВА ВКЛ И ВОПРОС ПОПРАВЫ ТРЕТЬЕГО СТАТУТА ВКЛ НА СЕЙМИКАХ НОВОГОРОДСКОГО ВОЕВОДСТВА В 1587–1632 гг.

***А. А. РАДОМАН***[1)]

[1)]*Независимый исследователь, пер. Некрасова, 3-2, 220040, г. Минск, Беларусь*

Утверждается, что поветовые сеймики Новогородского воеводства неоднократно использовали свое право законодательной инициативы. Отмечено, что в 1587 г. было предложено внести изменения в ряд статей проекта Статута Великого княжества Литовского, которые определяли состав преступления «оскорбление королевского величества», юридическую ответственность за его совершение и порядок судебного рассмотрения таких дел, что могло повлиять не только на окончательную редакцию ст. 2–5 раздела I, но и на разработку и принятие ст. 2 конституций сейма 1588 г. Констатируется, что в 1601 и 1607 гг. новогородский сеймик инициировал принятие решений, которые вносили поправки в текст ст. 46 раздела IV Статута Великого княжества Литовского, которая определяла сроки проведения сессий земских судов. Указано, что в 1607 г. слонимский сеймик через рецепцию коронного права внес коррективы в текст ст. 104 раздела IV Статута Великого княжества Литовского, которая определяла количество и обязанности возных генералов, и статутная норма была изменена в результате санкционирования монархом решения, принятого на региональном уровне. Замечено, что представители новогородской шляхты протестантского вероисповедания кальвинисты А. Харитонович, великий писарь (1574–1589), и Е. Головня, новогородский земский судья (1580–1598), а также антитринитарий В. Зенкович-Тихинский, маршалок (1588–1613) и земский судья Новогородской земли (1598–1613), принимали активное участие в работе над систематизацией права не только на сеймиках, но и на главных съездах Великого княжества Литовского, на сеймах и в составе комиссий, которые создавались в целях исправления и систематизации отечественного законодательства.

***Ключевые слова:*** систематизация права и законодательства; кодификационная деятельность; Статут ВКЛ; сеймики; решения и инструкции сеймиков; сеймовые конституции.

# СІСТЭМАТЫЗАЦЫЯ ПРАВА ВКЛ І ПЫТАННЕ ПАПРАВЫ ТРЭЦЯГА СТАТУТА ВКЛ НА СОЙМІКАХ НОВАГАРОДСКАГА ВАЯВОДСТВА Ў 1587–1632 гг.

***А. А. РАДАМАН***[1*]

[1*]*Незалежны даследчык, зав. Някрасава, 3-2, 220040, г. Мінск, Беларусь*

Сцвярджаецца, што павятовыя соймікі Навагародскага ваяводства неаднаразова карысталіся правам заканадаўчай ініцыятывы. Адзначана, што ў 1587 г. было прапанавана ўнесці змены ў шэраг артыкулаў праекта Статута Вялікага Княства Літоўскага, якія вызначалі склад злачынства «знявага каралеўскай вялікасці», юрыдычную адказнасць за яго здзяйсненне і парадак судовага разгляду такіх спраў, што магло паўплываць не толькі на канчатковую рэдакцыю арт. 2–5 раздзела I, але і на распрацоўку і прыняцце арт. 2 канстытуцый сойма 1588 г. Канстатуецца, што ў 1601 і 1607 гг. навагародскі соймік выступіў з ініцыятывай прыняцця ўхвал, якія ўносілі папраўкі ў тэкст арт. 46 раздзела IV Статута Вялікага Княства Літоўскага, які вызначаў тэрміны правядзення сесій земскіх судоў. Заўважана, што ў 1607 г. слонімскі соймік праз рэцэпцыю кароннага права ўнёс карэктывы ў тэкст арт. 104 раздзела IV Статута

**Образец цитирования:**
Радаман А. А. Сістэматызацыя права ВКЛ і пытанне папраўы Трэцяга статута ВКЛ на сойміках Навагародскага ваяводства ў 1587–1632 гг. // Журн. Белорус. гос. ун-та. История. 2018. № 2. С. 21–31.

**For citation:**
Radaman A. A. The systematization of law and legislation of the Grand Duchy of Lithuania and the question of the correction of the Third Statute of the Grand Duchy of Lithuania on the dietines of the Novogorodok voivodship in 1587–1632. *J. Belarus. State Univ. Hist.* 2018. No. 2. P. 21–31 (in Belarus.).

**Автор:**
***Андрей Александрович Радоман*** – независимый исследователь.

**Author:**
***Andrei A. Radaman***, independent researcher.
*andrej.radaman@gmail.com*

Вялікага Княства Літоўскага, які вызначаў колькасць і абавязкі возных-генералаў, і статутная норма была зменена ў выніку санкцыянавання манархам рашэння, прынятага на рэгіянальным узроўні. Паказана, што прадстаўнікі навагародскай шляхты пратэстанцкага веравызнання кальвіністы А. Харытановіч, вялікі пісар (1574–1589), і Ё. Галаўня, навагародскі земскі суддзя (1580–1598), а таксама антытрынітарый В. Зянковіч-Ціхінскі, маршалак (1588–1613) і земскі суддзя Навагародскай зямлі (1598–1613), прымалі актыўны ўдзел у працы над сістэматызацыяй права не толькі на сойміках, але і на галоўных з'ездах Вялікага Княства Літоўскага, соймах і ў складзе камісій, якія ствараліся з мэтай выпраўлення і сістэматызацыі айчыннага заканадаўства.

***Ключавыя словы:*** сістэматызацыя права і заканадаўства; кадыфікацыйная дзейнасць; Статут ВКЛ; соймікі; ухвалы і інструкцыі соймікаў; соймавыя канстытуцыі.

# THE SYSTEMATIZATION OF LAW AND LEGISLATION OF THE GRAND DUCHY OF LITHUANIA AND THE QUESTION OF THE CORRECTION OF THE THIRD STATUTE OF THE GRAND DUCHY OF LITHUANIA ON THE DIETINES OF THE NOVOGORODOK VOIVODSHIP IN 1587–1632

***A. A. RADAMAN***[a]

[a]*Independent researcher, 3-2 Niakrasava Lane, Minsk 220040, Belarus*

This paper tells that the county gentry assemblies (*dietines*, Belarus. *sojmiki* or Pol. *sejmiki*) of the Novogorodok and Slonim districts of the Novogorodok Voivodship of the Grand Duchy of Lithuania have repeatedly used the right of legislative initiative. In Interregnum 1587, the Novogorodok *sojmik* (pre-diet dietine) initiated the amendments to a number of articles of the draft Third Statute of the Grand Duchy of Lithuania, which determined what should be called the insulting of the Royal Majesty's, the legal responsibility for its commission and the procedure for judicial review of such cases (art. 2–5 of chapter I).This could affect not only their final wording, but also the development and adoption of art. 2 of the Diet's Constitutions of the Coronation Diet (Belarus. *sojm*, *sjem* or *sejm*, Pol. *sejm*) of 1588. In 1601 and 1607, the Novogorodok *sojmik* initiated the adoption of Diet's constitutions, which amended the text of art. 46 of chapter IV of the Third Statute of the Grand Duchy of Lithuania 1588. Which, in its turn, determined the dates of the sessions of Novogorodok District's Land Court. In 1607 at the regional level through the reception of the Crown Law Slonim Sejmik made adjustments to the text of art. 104 of chapter IV of the Third Statute of the Grand Duchy of Lithuania, which determined the number of general bailiffs (Belarus. *vozny general*) and their duties. The representatives of the Novogorodok politically-active nobility protestant activists such as Calvinists Andrei Kharitonovich Obrinsky, the grand notary of Lithuania in 1574–1589 and Esif Holovnya, the Novogorodok District's land judge in 1580–1598, and as well as antitrinitarian Vasil Zenkovich-Tikhinsky, the leader of the nobility (Belarus. *marshalak*) of Novogorodok District in 1588–1613 and the Novogorodok District's land judge in 1598–1613 had been taking an active part in the work on the systematization of the law of the Grand Duchy of Lithuania not only at the sejmiks, but also at the Congresses of Estates of the Grand Duchy of Lithuania, at the Commonwealth Diets and in commissions that were set up in the Diets with a goal to correct and systematize the domestic legislation.

***Key words:*** systematization of legislation; legal system; codification; Statute of the Grand Duchy of Lithuania 1588; county gentry assemblies; sojmiki; dietines instructions.

Актуальнасць гэтага даследавання абумоўлена недастатковай распрацаванасцю ў гістарыяграфіі праблемы эвалюцыі протапарламенцкіх інстытутаў і рэгіянальных органаў шляхецкага саслоўнага самакіравання Вялікага Княства Літоўскага (ВКЛ), злучанага з Польскім Каралеўствам рэальнай дзяржаўнай уніяй. У рамках комплекснага даследавання, прысвечанага дзейнасці шляхецкіх з'ездаў Навагародскага ваяводства, была пастаўлена мэта вызначэння галоўных кірункаў, тэндэнцый і асаблівасцей эвалюцыі павятовых соймікаў названага рэгіёна ў другой палове XVI – пачатку XVII ст. Мэта абумовіла пастаноўку шэрагу задач, такіх як вызначэнне пазіцыі шляхты ваяводства па пытаннях заканадаўчай дзейнасці і кадыфікацыі права, акрэсліванне складу ваяводскай соймікавай рэпрэзентацыі ў камісіях, якія займаліся праблемамі сістэматызацыі заканадаўства.

Метадалагічную аснову праведзенага даследавання склаў комплекс агульнанавуковых і спецыяльных метадаў пазнання, якія грунтуецца на сістэмным і палідысцыплінарным падыходах. Апошні выкарыстаны ў сувязі з тым, што праблематыка даследавання ўваходзіць у сферу інтарэсаў гісторыі дзяржавы і права (навуковая спецыяльнасць 12.00.01). Так, пры пры аналізе нарматыўных прававых і правапрымяняльных актаў ужываўся гісторыка-прававы метад. Прасапаграфічны метад выкарыстоўваў-

ся пры вывучэнні шляхоў і варыянтаў сацыяльнай мабільнасці прадстаўнікоў павятовых эліт, рэалізацыі іх кар'ерных памкненняў.

Насуперак патрабаванням акта-дагавора Люблінскай уніі 1569 г., які прадугледжваў уніфікацыю права суб'ектаў дзяржаўна-прававога саюза Рэчы Паспалітай абодвух народаў, у дзяржаве літвінаў і русінаў была захавана асобная прававая сістэма, ядром якой з'яўляўся Статут ВКЛ [1, s. 35–36; 2, p. 280]. У перыяд з 1567 па 1578 г. у Статут 1566 г. былі ўнесены значныя змены і дапаўненні, пасля чаго падрыхтаваны на яго аснове праект новага акта кадыфікацыі быў паартыкульна разгледжаны галоўным дзяржаўным з'ездам ВКЛ у студзені – сакавіку 1584 г. У абмеркаванні праекта ўдзельнічалі і кальвіністы з Навагародскай зямлі – навагародскі ваявода Мікалай Радзівіл, віцебскі кашталян Мальхер Сноўскі (у 1565–1580 гг. – навагародскі земскі суддзя) і Ёсіф Галаўня[1] (у 1580–1598 гг. – навагародскі земскі суддзя) [3, s. 347–351; 4, s. 149–160; 5, s. 621]. Спрэчныя артыкулы былі ўзгоднены на сойміках 3–5 снежня 1584 г. і на галоўным сойміку ВКЛ у Ваўкавыску 17–21 снежня 1584 г.[2], аднак прадстаўлены на пасяджэнні сойма 1585 г. праект не быў зацверджаны[3] [6, c. 55, 57]. У час бескаралеўя на неабходнасці ўнясення змен у тэкст законапраекта ў маі 1587 г. настойвала навагародская шляхта: *Если бы прышло до того поправовать тепер Статуту – поправить артыкулов о ображеню маестату королевского. А може ли час быть, абы вес перед коронацыею короля прышлого поправен и до утвержения новому пану подан был* [7, c. 166]. У апошні дзень пасяджэнняў галоўнага сойміка ВКЛ у Ваўкавыску 8–15 чэрвеня 1587 г. было прынята рашэнне ўнесці канчатковыя праўкі ў законапраект[4], і на элекцыйным сойме ў чэрвені – ліпені 1587 г. дэпутаты, выбраныя з ліку сенатараў і прадстаўнікоў шляхты ВКЛ, толькі ў сваім коле, без удзелу палякаў, узгаднілі канчатковую рэдакцыю Статута ВКЛ[5] [3, s. 350, 373, 381; 8, s. 59]. Сярод удзельнікаў гэтага абмеркавання мусіў быць і прысутны на сойме навагародскі пасол Андрэй Харытановіч (Вобрынскі) (кальвініст), які ў 1574–1589 гг. займаў урад аднаго з чатырох вялікіх пісараў ВКЛ[6] [9, c. 291–296; 10, c. 55–59].

Праз паўгода, выкарыстаўшы складанае становішча Жыгімонта Вазы, правы якога на польскі трон аспрэчвалі асобныя еўрапейскія манархі, пасольства ВКЛ пасля прадстаўлення тэксту Статута ВКЛ на пасяджэннях каранацыйнага сойма 21, 23 і 25 студзеня дамаглося 27 студзеня 1588 г. адабрэння манархам і кароннымі станамі мірнага пагаднення з Вялікім Княствам Маскоўскім, падзелу Інфлянтаў і зацвярджэння Статута ВКЛ у абмен на прызнанне Жыгімонта вялікім князем і прынясенне яму прысягі[7] [3, s. 408–420; 8, s. 71, 73–74; 11, т. 1, ч. 2, c. 200–205; 12; 13, s. 39–51; 14, s. 45–52; 15, s. 217–220]. Пасля атрымання вечарам таго ж дня весткі пра перамогу кароннага гетмана Яна Замойскага ў бітве пад Бычынай палякі адмовіліся ад замацавання дасягнутых пагадненняў соймавымі канстытуцыямі, і Статут ВКЛ быў уведзены ў дзеянне канфірмацыйным прывілеем, які манарх выдаў і падпісаў 28 студзеня 1588 г. Замацаваны малой дзяржаўнай пячаткай, акт быў контрасігнаваны падканцлерам Львом Сапегам і вялікім пісарам Габрыэлем Войнам[8]. У тым жа годзе 1 лютага вялікі князь літоўскі выдаў яшчэ адзін прывілей, які пацвярджаў і дапаўняў папярэдні, у тым ліку ўносіў змены ў арганізацыю дзейнасці Галоўнага Трыбунала ВКЛ[9] [16, c. 107–109]. У сваім канчатковым варыянце Статут 1588 г. уключаў 488 артыкулаў, згрупаваных у 14 раздзелах [17–20]. Застаецца невядомым, якія менавіта прапановы прадстаўнікоў навагародскай шляхецкай эліты былі ўлічаны пры канчатковым рэдагаванні арт. 2, 3, 4 і 5 раздзела I, што вызначалі склад злачынства знявагі каралеўскай вялікасці, юрыдычную адказнасць за яго здзяйсненне і парадак судовага разгляду такіх спраў, але жаданне навагародскай шляхты ў маі 1587 г. *поправить артыкулов о ображеню маестату королевского* [7, c. 166] карэлюе па часе таксама

---

[1]Arch. Gł. Akt Daw. w Warsz. (далей – AGAD), Arch. Radziwiłłów (далей – AR). Dz. V, № 1759; Monumenta Poloniae Vaticana / ed. E. Kuntze. T. VI/2. Kraków, 1938. S. 631; T. VII/3. Kraków, 1950; S. 59; Akta zjazdów stanów Wielkiego Księstwa Litewskiego : w 2 t. (далей – AZS WKsL) / oprac. H. Lulewicz. T. II. Okresy panowań królów elekcyjnych XVI–XVII w. Warszawa : Neriton, 2009. S. 73–78.

[2]AZS WKsL. T. II. S. 78–85; Ліст С. Баторыя ад 25.10.1584 г. да паноў Юндзілаў аб скліканні сойма на 15.01.1585 г., соймікаў перад ім на 3.12.1584 г. і галоўнага сойміка ў Ваўкавыску на 17.12.1584 г. // Грод. дзярж. гіст.-археал. музей. КП № 9219/17.

[3]Dyaryusze sejmowe roku 1585. W dodatkach: Ułamki dyaryusza sejmowego roku 1582, akta sejmikowe i inne akta odnoszące się do sejmu 1585 r. / wyd. A. Czuczyński. Kraków : Drukarnia Uniw. Jagiell., 1901. S. 267.

[4]AZS WKsL. T. 1. Okresy bezkrólewi (1572–1576, 1586–1587, 1632, 1648, 1696–1697, 1706–1709, 1733–1735, 1763–1764). Warszawa : Neriton, 2006. S. 244.

[5]Biblioteka ks. Czartaryskich w Krakowie. Rękopis (далей – BCzart. Rkps.). 2243 IV. S. 114; AZS WKsL. T. I. S. 252.

[6]AZS WKsL. T. 1. S. 256, 261, 266.

[7]Diariusze Sejmu koronacyjnego Zygmunta III Wazy 1587/1588 roku / oprac. I. Kaniewska. Kraków : Tow. wydawnicze «Historia Iagiellonica», 2016. S. 7–8, 11–12, 16–17, 21, 53–57, 70–71, 73–74. У склад пасольства, акрамя трокскага ваяводы Яна Глябовіча і падканцлера Льва Сапегі, уваходзілі 18 прадстаўнікоў пасольскага кола галоўнага з'езда ВКЛ (у тым ліку Васіль Зянковіч-Ціхінскі, які прадстаўляў Навагародскае ваяводства).

[8]AGAD. Zbiór dok. perg. № 7937; Статут ВКЛ 1588 г. тут і далей цытуецца паводле выдання: Статут Вялікага Княства Літоўскага 1588 г. Тэкст. Даведнік. Каментарыі. Мінск : Беларус. сав. энцыкл. імя Петруся Броўкі, 1989 (далей – Статут ВКЛ 1588 г.). С. 42–43.

[9]AGAD. Dz. II. № 215. S. 1–2.

з распрацоўкай і ўхваленнем арт. 2 *De crimine laesae Maiestatis Regiae et perduellionis* соймавых канстытуцый ад 30 студзеня 1588 г.[10]

Прававую моц нормы Трэцяга статута ВКЛ набылі ў першы дзень земскіх трохкрольскіх судовых рокаў[11] 7 студзеня 1589 г. Асноўны закон абвяшчаў фармальную роўнасць усіх абывацеляў ВКЛ перад *тым одным правом писаным* і замацоўваў асноўныя прынцыпы прававой сістэмы, якая ўспрыняла многія ідэі эпохі гуманізму і Рэфармацыі[12]. Заканадаўцы вызначалі сваю Айчыну як самастойную дзяржаву – *славное паньство Великое Князство Литовское* (раздзел III, арт. 1)[13]. Як адзначыў расійскі гісторык Іван Лапа, Статут ВКЛ быў складзены так разумна, што яго не было патрэбы карэктаваць нават у выпадку разрыву уніі з Польскім каралеўствам ці заключэння уніі з іншай дзяржавай [11, т. I, ч. 2, с. 88, 143–144]. Таму, нягледзячы на існаванне міждзяржаўнага дагавора, у артыкулах Статута ВКЛ Польская дзяржава згадваецца толькі зрэдку, а само ўнійнае пагадненне называецца толькі аднойчы – у арт. 29 раздзела III, у якім гаворка ішла аб прававых актах, выдадзеных у 1569 г. для Валынскай, Падляшскай і Кіеўскай зямель[14]. У якасці агульных з Польскім каралеўствам прававых норм у Статут ВКЛ 1588 г. былі ўнесены ў перакладзе на старабеларускую мову акт *конфедерацыи, часу интеркгни в той речы межы станы Коруны Польское и ВКЛ учиненой* ад 28 студзеня 1573 г. (раздзел III, арт. 3) і арт. 15 Генрыкавых артыкулаў (пагадненне паміж каралём-электам Генрыхам Валуа і прывілеяванымі станамі Рэчы Паспалітай) (раздзел III, арт. 51)[15] [21]. Супраць унясення ў тэкст Статута ВКЛ акта Варшаўскай канфедэрацыі 1573 г. выступіла толькі рымска-каталіцкае духавенства, а 8 лютага 1588 г. у Кракаве віленскі кусташ Бенедыкт Война ўнёс нават афіцыйную пратэстацыю ў кнігі дзяржаўнай канцылярыі ВКЛ[16]. Такім чынам, распрацаваны ў перыяд барацьбы за захаванне дзяржаўнага суверэнітэту, Трэці статут ВКЛ завяршыў работу па сістэматызацыі права і заканадаўства, якая вялася на працягу ўсяго XVI ст., і, па сваёй сутнасці, з'яўляўся вынікам глыбокага пераасэнсавання ўсім палітычным народам ВКЛ кадыфікацыйнай дзейнасці, якая ажыццяўлялася статутнымі камісіямі 1568 і 1569–1574 гг. першапачаткова ў канцэптуальных рамках *поправы – исправления и дополнения Второго статута* [11, т. 1, ч. 1, с. VI, 1–2]. Абсалютная большасць яго артыкулаў адлюстравала і замацавала ўзгодненую палітычную праграму правячых колаў літвінскай і русінскай эліты, якая давала афіцыйнае тлумачэнне ўнійным пагадненням. Па сутнасці, тэкст Статута ВКЛ дазволіў дасягнуць кампрамісу паміж інтарэсамі манарха, прадстаўнікоў уплывовых арыстакратычных родаў і лідараў рэгіянальных шляхецкіх карпарацый. Пры гэтым асноўны закон успрыняў далёка не ўсе заканадаўчыя ініцыятывы пратэстанцкіх ідэолагаў, якія актыўна выказваліся ў друку, на сойміках і галоўных з'ездах ВКЛ па розных праблемах рэфармавання палітычных і прававых інстытутаў дзяржавы.

Зацвярджэнне Статута ВКЛ 1588 г. і яго апублікаванне аказала значны ўплыў на кадыфікацыйную дзейнасць у Польшчы. Ужо на сойме 1589 г. стварылі камісію для карэктуры кароннага земскага права і падрыхтоўкі Статута Польскага каралеўства, таксама было ўхвалена рашэнне аб фарміраванні камісіі для выпраўлення законаў, якія дзейнічалі ў Брацлаўскім і Валынскім ваяводствах (арт. 37, 76)[17]. У той жа час асобныя прадстаўнікі польскай шляхты новы Статут ВКЛ лічылі ўведзеным у дзеянне з парушэннем актаў уніі і дзейнага агульнага заканадаўства, а таму патрабавалі яго рэвізіі. Напярэдадні сойма 1590 г. манарх вынес праблему на абмеркаванне перадсоймавых соймікаў. Некаторыя каронныя соймікі абавязалі паслоў да таго, каб зацверджаны манархам Статут ВКЛ быў перададзены для ацэнкі і выпраўлення дэлегатам станаў Кароны Польскай. Так, серадскі соймік наказваў паслам данесці да прадстаўнікоў ВКЛ, што іх дзеянні трактуюцца як парушэнне унійных пагадненняў і прысяг і запатрабаваў, каб літвіны перадалі свой нававыдадзены Статут ВКЛ на разгляд каронных станаў на сойме [3, s. 418; 14, s. 52; 22, s. 222; 23, s. 231]. Яшчэ больш жорсткую пазіцыю 8 лютага 1590 г. заняў люблінскі соймік, які наказваў паслам, каб *новы Літоўскі Статут не быў зацверджаны, пакуль яго не прагледзяць нашы карэктары*[18] (тут і далей пераклад наш. – *А. Р.*) [14, s. 52].

[10]Volumina Constitutionum (далей – VC) : w <10> t. T. II. 1550–1609. Vol. 1. 1550–1585 / przygotow. do druku W. Uruszczak, S. Grodziski, I. Dwornicka. Warszawa : Wydaw. Sejm., 2005 ; T. II. 1550–1609. Vol. 2. 1587–1609 / przygotow. do druku W. Uruszczak, S. Grodziski. Warszawa, 2008. S. 62–63.

[11]Зімовыя судовыя сесіі земскіх судоў, якія праходзілі пасля свята Трох Каралёў.

[12]Уплыў ідэй гуманізму і Рэфармацыі на прававую і палітычную думку Еўропы XVI–XVII стст. грунтоўна прааналізаваны ў навуковых працах К. Скінера і Г. Бермана (гл.: Berman H. J. Law and Revolution. Vol. II. The Impact of the Protestant Reformations on the Western Legal Tradition. Cambridge : Cambr. Univ. Press, 2003; *Скиннер К.* Истоки современной политической мысли : в 2 т. / пер. с англ. А. А. Олейникова, А. А. Яковлева. М. : Изд. дом «Дело», 2018. Т. 1 : Эпоха Ренессанса ; Т. 2 : Эпоха Реформации).

[13]Статут 1588 г. С. 111.

[14]Статут 1588 г. С. 125–126, 369.

[15]Статут 1588 г. С. 112–114, 138, 364, 373–374; VC. T. II. Vol. 1. S. 358.

[16]Нац. гіст. арх. Беларусі (далей – НГАБ). КМФ-18 (Рос. гос. арх. древ. актов (РГАДА). Ф. 389). Воп. 1. Спр. 278. Арк. 176–176 адв.; Спр. 279. Арк. 557.

[17]VC. T. II. Vol. 2. S. 106, 113.

[18]Akta sejmikowe województwa lubelskiego (1572–1632) / oprac. H. Gmiterek. Lublin : Wydaw. Uniw. Marii Curie-Skłodowskiej, 2016. S. 74.

Сандамірская соймікавая інструкцыя ўтрымлівала аналагічнае патрабаванне: *Новы Літоўскі Статут, у якім вялікія памылкі, каб не быў зацверджаны, пакуль нашы карэктары не правядуць яго зверку* [13, s. 43–48; 14, s. 52][19]. Вядомыя інструкцыі і асобных соймікаў ВКЛ. Так, віленскі соймік забараняў даваць дазвол на змяненне Статута ВКЛ адной ці дзвюм асобам і прапаноўваў заканадаўча вызначыць наступны парадак унясення паправак у яго: ад кожнага ваяводства патрэбна выбраць па адным дэпутаце з ліку богабаязных людзей, што любяць справядлівасць, якія б пасля прынясення прысягі Статут ВКЛ не на сойме, але тут дома выпраўлялі, пасля чаго папраўкі неабходна было б адасланы ў паветы для абмеркавання на сойміках і толькі потым передаць іх на чарговы сойм для зацвярджэння. Дапускалася магчымасць зацвярджэння паправы соймавай канстытуцыяй з удакладненнем, каб *увесь Статут у цэласнасці заставаўся, чаго паны паслы з вялікай пільнасцю пасцерагаць маюць*[20] [6, с. 57]. Разгорнута прадставілі сваю пазіцыю па праблеме ўдзельнікі ашмянскага пасольскага сойміка: *Што ся дотычеть в сказанью его королевской милости около Статуту нашого литовского нововыданого, жебы ся в нем омылки и незгоды артыкулов, и повтораня слов непотребное могло направити и згодити порадне, то отсылаем через панов послов нашых до зъезду слонимского, жебы там в большом коле, або и на сойме, о том намову учынили ку поправе омылок и згоде противности артыкулов и повтараню слов непотребных, где, коли и через кого то маеть быти вчынено. Ведже абы такою поправою в речах самых ку прешкоде и заваде ясное справедливости людское отмена шкодливая в артыкулех не была чынена, жебы место покараня и чалюваня людей злых за ся добрым, цнотливым, непотварным справедливе чого позыскуючым дорога ку справедливости их ясной загорожона не была, иле убожшым против можнейшых, также и межы ровными собе. А поправованья и корыкгованья Статуту нашого через паны поляки панове послове нашы весполок з их милостью паны радами и паны послы иншыми мають пилно боронити и не допущать, кгдыж над список унии панове поляцы ничого до нашых прав не мають, и поправа их не им, але нам належыть и вжо нам тот Статут прывилем и попрысяженьем Е*[*го*] *К*[*оролевское*] *М*[*илости*] *ест утвержон*[21] [24, с. 73].

Такім чынам, у разуменні шляхты ВКЛ, як трапна адзначыў У. Падалінскі, «для сойма адводзілася толькі роля зацвярджэння паправак, але ніяк не іх абмеркавання!» [6, с. 57]. З такім станам рэчаў пагаджаўся і манарх. Праз год, 22–23 лютага 1591 г., навагародскі рэляцыйны соймік у інструкцыі паслам на галоўны з'езд ВКЛ наказваў: *А паколькі выпраўленне Статута і Трыбунала Яго Каралеўская Міласць нам дазволіў, пра спосаб, месца, асоб і пра ўсё, што належыць да той справы, нашым панам паслам даручаем разам з іншымі ўсімі панамі пасламі ў ВКЛ абмяркоўваць і ўзгадняць, толькі таго пільна пасцерагаючы, каб з Навагародка Трыбунал у іншую мясцовасць перанесены не быў*[22]. Паколькі практыка правапрымяняльнай дзейнасці выявіла пэўныя недахопы і нестыкоўкі ў тэксце Статута ВКЛ, 20 мая 1591 г. на галоўным з'ездзе ВКЛ у Вільні быў вызначаны склад камісіі ў складзе двух сенатараў, адным з якіх быў канцлер, і прадстаўнікоў шляхты (па адным ад кожнага ваяводства) для выпраўлення Статута 1588 г. і *Способа прав трыбунальских*. Пачатак пасяджэнняў быў запланаваны на дзень святога Марціна (11 лістапада). Ад віленскай шляхты ў камісію ўвайшоў кальвініст Ян Вільчак, ад трокскай – упіцкі земскі суддзя католік Станіслаў Белазор (з 16 чэрвеня – падкаморы)[23], ад віцебскай – кальвініст Андрэй Цеханавецкі, яны, як і невядомы дэпутат ад Полацкага ваяводства, былі выбраны яшчэ да прыняцця ўхвалы з'езда[24]. Застаюцца невядомымі члены камісіі ад Жамойці, Берасцейскага, Мсціслаўскага і Менскага ваяводстваў, якія павінны былі выбірацца на ваяводскіх сойміках 1 жніўня 1591 г. Ад Навагародскага ваяводства ў склад камісіі, верагодна, увайшоў маршалак Навагародскай зямлі, заслужаны жаўнер Васіль Зянковіч-Ціхінскі, пра ягога згадвае ў лісце да трокскага ваяводы Мікалая Крыштафа Радзівіла ад 9 лютага 1592 г. канцлер ВКЛ Л. Сапега, які знаходзіўся ў Вільні: *Латаем статутавыя паправы. Ёсць цяжкасці.* [*Сярод дэпутатаў*] *прысутнічае дастаткова* [*шмат*] *упартых, і некалькі недалёкіх, якія на тым усё вырашылі, што толькі адмаўляць і найлепшую прапанову. Часам самі не ведаюць, чаго хочуць. Калі пытаю, чаго хочуць, каб было запісана, то адказваюць: «Сам не ведаю, як выказаць тое, пра што думаю». А ведай цябе злы дух, як я магу зразумець тваю фантазію, калі ты сам не здольны пра яе выказацца… Так мне ад гэтага агідна стала за настолькі кароткі час, што і сам у сабе сумняваюся, што іх сцярплю, аднак пра тую справу буду помніць, толькі мяне Ваша Міласць засцеражы які, таксама амаль упэўнены,*

[19]На працягу 1590-х гг. каронныя соймікі працягвалі настойваць на скасаванні Статута 1588 г. як падрыхтаванага «на прыватных з'ездах у Літве», уведзенага ў дзеянне насуперак унійным пагадненням і не пераглежданага на сойме, асабліва ў тых рэчах, якія шкодзілі Польскай Кароне. Гэтага патрабавала, напрыклад, ухвала серадскага сойміка 1593 г., а таксама інструкцыя перадсоймавага сойміка Кракаўскага ваяводства ў Прашавіцах 1598 г. [14, s. 52–53].

[20]BCzart. Rkps. 2243 IV. S. 186.

[21]AGAD. AR. Dz. II. № 242. S. 7–8.

[22]Biblioteka Naukowa Polskiej Akademii Umiejęt. i Polskiej Akademii Nauk w Krakowie. Rękopis (далей – BN PAU i PAN w Kr. Rkps.). 365. S. 5–8.

[23]Urzędnicy Wielkiego Księstwa Litewskiego : spisy : w 10 t. / red. A. Rachuba. T. II. Województwo trockie: XIV–XVIII wiek / oprac. H. Lulewicz [i in.]. Warszawa : Wydaw. «DiG», 2009. № 3840, s. 514; № 3699, s. 496.

[24]AZS WKsL. T. II. S. 98–99.

*што пан Зянковіч*[25] [11, т. I, ч. 2, с. 408]. Фінансаванне дзейнасці дэпутатаў камісіі вялося за кошт сродкаў «страўнага» падатку, які быў ухвалены галоўным з'ездам ВКЛ для большасці ваяводстваў у памеры 0,5 гроша з валокі ці службы, а для Полацкага і Мсціслаўскага ваяводстваў – 1 грош. Падаткаабкладанню на гэтыя патрэбы не падлягалі ўласныя маёнткі манарха[26]. Вядома, што на дыеты для навагародскага прадстаўніка слонімскі паборца збіраў падатак у памеры 0,5 гроша з валокі [25, с. 28]. Праца камісіі павінна была абмяркоўвацца 23 жніўня 1592 г. у Слоніме на пасяджэнні галоўнага сойміка [11, т. I, ч. 2, с. 409]. Напярэдадні кракаўскага сойма, 29–30 снежня 1594 г., віленскі соймік наказаў паслам Яну Глябовічу і Аляксандру Хадкевічу нагадаць пра неабходнасць скончыць выпраўленне Статута ВКЛ, паколькі на гэту справу ўся дзяржава выдаткавала вялікія сродкі[27]. На думку І. Лапы, праца камісіі скончылася безвынікова [11, т. I, ч. 2, с. 410–411], аднак у 1981 г. В. Раўдзялюнас апублікаваў невядомы раней тэкст прывілея Жыгімонта III, выдадзены на адным з варшаўскіх соймаў другой паловы 1590-х гг.[28] Названы прававы акт утрымлівае інфармацыю аб выніках працы камісіі, якая зняла супярэчнасці паміж асобнымі артыкуламі і ўнесла ў тэкст Статута ВКЛ пэўныя рэдакцыйныя праўкі (раздзел I, арт. 14, 20, 22; раздзел III, арт. 2, 19; раздзел IV, арт. 5, 23, 32, 48, 49, 51, 53, 62, 66, 75, 92, 94, 100, 105; раздзел VII, арт. 2, раздзел XIV, арт. 2) [26, с. 132–140]. Аднак для таго, каб адказаць на пытанне, наколькі нормы дадзенага прывілея былі ўлічаны ў практыцы правапрымянення, неабходна правесці спецыяльнае даследаванне [22, с. 226].

У канцы XVI – пачатку XVII ст. ініцыятарам унясення змен у права неаднаразова выступала шляхта на сойміках, якія мелі права заканадаўчай ініцыятывы. Можна прывесці некалькі прыкладаў праватворчай дзейнасці шляхты Навагародскага ваяводства. Так, у навагародскай соймікавай інструкцыі паслам на сойм 1598 г. утрымліваўся наступны пункт: *А иж се многие ускаржают на Трыбунал же через пракътыку до тых судов прыходят, к тому же слуги и юркгелтники панские до тых судовъ обираны бывають, старатисе тогды панове послове нашы мають, абы то правом варовано было, жебы слуги панские, юркгелтники земские, кгродские, до тых судов обираны не были* [27, с. 155–156]. Відавочна, што ў падобным змяненні тэксту *Способа прав Трибунальских* не былі зацікаўлены ўплывовыя прадстаўнікі феадальнай арыстакратыі і іх кліенты, таму ў дадзеным выпадку заканадаўчая ініцыятыва не была рэалізавана, хоць сойм 1598 г. разглядаў пытанне аб выпраўленні названага закона і ўнёс пэўныя змены ў дзейнасць Галоўнага Трыбунала ВКЛ (гл. арт. 22 і 23 соймавых канстытуцый[29]).

У снежні 1600 г. на пасяджэнні навагародскага перадсоймікавага сойміка ў інструкцыю паслам на сойм 1601 г.[30] Васілю Зянковічу-Ціхінскаму і Мікалаю Падарэўскаму (абодва антытрынітарыі) быў унесены пункт, які абавязваў іх паставіць пытанне аб змяненні тэрмінаў земскіх судовых сесій, якія адбываліся ў ВКЛ тры разы на год і пачыналіся пасля святаў Трох каралёў (6 студзеня), Троіцы (канец мая – пачатак чэрвеня) і святога Міхаіла (29 верасня) (раздзел IV, арт. 46)[31]. На сойме навагародскі маршалак (1588–1613) і земскі суддзя (1598–1613) В. Зянковіч-Ціхінскі агучыў ініцыятыву, паводле якой судовыя сесіі мусілі праходзіць у розных паветах ВКЛ у розны час (як гэта было ў Кароне Польскай). Пасля абмеркавання заканадаўчай ініцыятывы ў соймавыя канстытуцыі быў уключаны арт. 125, які ўносіў змены ў арт. 46 раздзела IV Статута ВКЛ, але змяняў тэрміны правядзення сесій земскага суда толькі ў Навагародскім павеце. Было вырашана, што ў гэтым рэгіёне судовыя сесіі будуць адбывацца пасля святаў Маці Божай Грамнічнай (2 лютага), святога Марка (25 красавіка) і дня Усіх Святых (1 лістапада). Юрыдычную сілу дадзеная норма набыла пасля заканчэння траецкіх рокаў 1601 г.[32] У лютым 1602 г. на грамнічных *новых... злых в сэрцох людских розэрваных рокох* [28, с. 116] узнікла канфліктная сітуацыя, паколькі частка шляхты палічыла, што соймавыя паслы недакладна зразумелі сутнасць заканадаўчай ініцыятывы сойміка [29, s. 74–75]. Пазней, у 1607 г., навагародскі перадсоймавы соймік выступіў з ініцыятывай перанесці пачатак земскіх судовых сесій з наступнага дня пасля свята святога Марка на наступны дзень пасля Троіцы, паколькі ў красавіку дарогі знаходзіліся яшчэ ў дрэнным стане і ў шляхты ўзнікалі складанасці з тым, каб даехаць да адміністрацыйнага цэнтра ваяводства, што і было замацавана ў арт. 4 соймавых канстытуцый

---

[25] Archiwum domu Radziwiłłów: listy ks. Mikołaja Krzysztofa Radziwiłła Sierotki, Jana Zamojskiego, Lwa Sapiehy. Kraków, 1885. № XXVII, s. 212–213.

[26] AZS WKsL. T. II. S. 98–99.

[27] Акты, издаваемые археографической комиссией, Высочайше учреждённой в Вильне для разбора древних актов : в 39 т. Т. VIII. Акты Виленского гродского суда (1577–1790) / предисл. И. Спрогиса. Вильна, 1875. № 157. С. 336.

[28] Паколькі датаванне дакумента было здзейснена даследчыкам на падставе філіграні 1594–1600 гг., застаецца невядомым, на якім менавіта з варшаўскіх соймаў другой паловы 1590-х гг. (1596, 1597, 1598 ці 1600 гг.) прывілей быў падрыхтаваны і зацверджаны манархам.

[29] VC. T. II. Vol. 2. S. 244.

[30] Рос. нац. б-ка. Ф. 971. Оп. 1. Авт. 126. Л. 1.

[31] Статут 1588 г. С. 175, 388.

[32] VC. T. II. Vol. 2. S. 294.

ВКЛ[33]. Такім чынам, у другі раз за кароткі час уносіліся змены ў статутнае заканадаўства, а менавіта ў арт. 46 раздзела IV Статута ВКЛ.

У снежні 1602 г. у слонімскай соймікавай інструкцыі адзначалася, што здараюцца выпадкі, калі пэўныя людзі з ВКЛ у сітуацыі, калі не маглі знайсці справядлівасці ў айчынным праве *roznemi a przewrotnemi powieściami* ўзялі за звычку пераносіць свае судовыя справы ў суды каронняй юрысдыкцыі (*do prawa Coronnego zaciągać*), чым ускладняюць на соймах справы Рэчы Паспалітай і парушаюць Статут ВКЛ. Паслам даручалася адстойваць патрабаванне забараніць падобную практыку [30, с. 236, 243].

Здараліся прэцэдэнты, калі сойміки Навагародскага ваяводства прымалі рашэнні, якія непасрэдна ўносілі пэўныя карэктывы ў статутнае заканадаўства. Так, у 1607 г. слонімская шляхта праз рэцэпцыю кароннага права прыняла ўхвалу аб увядзенні ў павеце пасады другога возного-генерала і абрала с *посродку себе на врад енеральский возновский человека доброго земенина повету Слонимского писма и звычаев права умеетного Дмитра Дешукевича*[34], тым самым парушыўшы арт. 104 раздзела IV Статута ВКЛ, які прадугледжваў наяўнасць у кожным з паветаў ВКЛ толькі аднаго возного-генерала (выключэнне, паводле закону, складала толькі Жамойць)[35]. Рэкамендаваўшы манарху кандыдатуру другога возного генерала на зацвярджэнне (першым быў С. Катовіч), слонімская шляхта абгрунтавала свае дзеянні, скіраваныя на карэкцыю статутнага права. У намінацыйным лісце вялікага князя літоўскага Дзешукевічу ад 25 мая 1607 г., які быў выдадзены ў час адбыцця соймавых пасяджэнняў і санкцыянаваў дзеянні слонімскага сойміка, адзначалася, што другі возны-генерал прызначаецца ў сілу рашэння шляхты, якая прыняла яго *видечы быть реч потребную, а зажываючы в том прыкладу права братьи своее, станов Короны Польское, которые догажаючы с правом и потребам своим, жебы се тым снадней отправовать могли, не под личбою таковых возных енералов зажывають, але только яко того потребу быть розумеють*[36] [29, s. 95]. У дадзеным выпадку норма Статута ВКЛ была зменена ў выніку санкцыянавання манархам рашэння, прынятага на рэгіянальным узроўні.

Дзейнасць ракашанаў і шырокае абмеркаванне на сойміках і соймах першай дэкады XVII ст. канцэптуальных праблем рэфармавання дзяржаўнага ладу Рэчы Паспалітай і непасрэдна патрабаванні соймікаў ВКЛ сталі прычынамі ўхвалення соймам 1609 г. рашэння аб стварэнні новай камісіі для выпраўлення законаў ВКЛ і прынцыпаў функцыянавання Галоўнага Трыбунала ВКЛ (скончэння выпраўлення закона, які рэгламентаваў яго дзейнасць, патрабаваў, напрыклад, слонімскі пасольскі соймік[37]). У склад камісіі ад сенатарскага стану ўвайшлі віленскі біскуп Б. Война, трокскі кашталян Юрый Радзівіл (кальвініст, які вывучаў гісторыю, палітыку, этыку і тэалогію ў Базелі і Страсбургу і быў адзіным сенатарам ВКЛ, які падтрымаў Сандамірскі рокаш), віцебскі ваявода Ян Завіша (католік), канцлер Л. Сапега (католік), якога мог замяшчаць на пасяджэннях падканцлер Г. Война (католік), а таксама дзевяць дэпутатаў ад шляхты: Ян ці Рафал (?) Рошчыц (ад Віленскага ваяводства), дынабургскі староста Адам Тальваш (ад Трокскага ваяводства), жамойцкі земскі суддзя Ян Себасцьян Кештарт (кальвініст; ад Жамойці)[38], азярышчанскі староста і полацкі пасол на сойм 1609 г. князь Крыштаф Друцкі-Саколінскі (католік; ад Полацкага ваяводства), навагародскі земскі суддзя і маршалак В. Зянковіч-Ціхінскі (ад Навагародскага ваяводства), трокскі падкаморы Багдан Агінскі[39] (праваслаўны; ад Віцебскага ваяводства) і Андрэй Пякарскі (кальвініст; ад Берасцейскага ваяводства)[40] [1, s. 47; 11, т. I, ч. 2, с. 411–412; 31, t. XXX, zesz. 2, s. 234–236]. Невядомым застаецца прадстаўніцтва ў камісіі Мсціслаўскага і Менскага ваяводстваў, якія павінны былі выбраць сваіх прадстаўнікоў пазней на сойміках. Распачаць працу камісія павінна была ў дзень святога Марціна, для таго каб прагледзець і выправіць законы ВКЛ, у тым ліку «Способ прав Трибунальских», *прыхіляючыся найбліжэй да хутчэйшага і лягчэйшага правасуддзя*[41]. Кворум для прыняцця рашэнняў меў месца нават пры адсутнасці трох членаў камісіі[42], асобныя з якіх мелі выдатную юрыдычную адукацыю[43].

---

[33]BN PAU i PAN w Kr. Rkps. 360. K. 201v; VC. T. II. Vol. 2. S. 362. Пастановы сойма 1607 г. былі падзелены на Канстытуцыю каронную і Канстытуцыю ВКЛ (VC). Так было таксама на соймах 1611, 1613, 1616 і 1621 гг. (VC. T. III. 1611–1640. Vol. 1. 1611–1626. Warszawa : Wydaw. Sejm., 2010. S. 13–38, 38–45; 118–140, 140–149; 193–216, 217–222, 297–309, 309–311), але ў часы панавання Жыгімонта III Вазы асобныя соймавыя канстытуцыі ВКЛ прымаліся не на кожным сойме [40].

[34]НГАБ. КМФ-18 (РГАДА. Ф. 389). Воп. 1. Спр. 89. Арк. 20.

[35]Статут 1588 г. С. 212–213, 402.

[36]НГАБ. Ф. 1785. Воп. 1. Спр. 22. Арк. 209 адв. – 210 адв.; НГАБ. КМФ-18. Спр. 89. Арк. 20–21.

[37]Muz. Nar. w Krakowie. Dz. VIII. Rkps. 750c/1. K. 1v.

[38]Urzędnicy WKsL : spisy : w 10 t. T. III. Księstwo Żmudzkie : XIV–XVIII wiek / oprac. H. Lulewicz [i in.]. Warszawa : Wydaw. «DiG», 2014. № 1124. S. 242.

[39]Там жа. T. II. № 524. S. 127. № 940. S. 173.

[40]Арт. 74 соймавых канстытуцый (VC. T. II. Vol. 2. S. 396); Обозрение исторических сведений о составлении Свода местных законов Западных губерний / изд. М. Я. Пергамент, А. Э. Нольде. СПб., 1910. С. 60.

[41]VC. T. II. Vol. 2. S. 396.

[42]Ibid.

[43]Князь К. Друцкі-Саколінскі вывучаў права ў Інгальштаце (1595, 1600), Рыме (1598) і Альтдорфе (1599). У 1598 г. з дазволу рэктара Рымскага ўніверсітэта М. Веліуса апублікаваў даследаванне па рымскім праве «Conclusiones iuridicae de legatis…», якое прысвяціў патрону Л. Сапегу і ў якім вывучаў пытанне паўнамоцтваў і дзейнасці легатаў на некалькіх дзясятках прыкладаў, галоўным чынам з Кодэкса Юсцініяна [31, t. XL, zesz. 1, s. 42–43].

Як лічыў І. Лапа, працы камісіі перашкодзіў пачатак ваенных дзеянняў супраць Вялікага Княства Маскоўскага восенню 1609 г. [11, т. I, ч. 2, с. 412], аднак Альбрэхт Станіслаў Радзівіл прыводзіць сведчанне пра пасяджэнне камісіі, якое адбылося ў 1611 г. і на якім старшынстваваў гарадзенскі падкаморы Пётр Валовіч[44] (католік, кліент М. К. Радзівіла[45]) [32, с. 94–96]. Паколькі дзейнасць камісіі, створанай у 1609 г., не прынесла плёну, арт. 5 соймавых канстытуцый ВКЛ, ухваленых на сойме 1611 г., прадугледжваў стварэнне новай кадыфікацыйнай камісіі для завяршэння карэктуры законаў і зверкі перапісаных кніг архіва дзяржаўнай канцылярыі. Сенатарскі стан прадстаўлялі, як і раней, Л. Сапега і Я. Завіша, да якіх далучаўся жамойцкі кашталян і лідскі староста князь А. Галаўчынскі-Рапалоўскі, таксама католік[46] [33, t. III, s. 57]. Ад шляхты кожнага павета на рэляцыйных сойміках павінны былі выбраць у склад камісіі па адным дэпутаце. Тыя ж соймікі павінны былі вызначыць падаткі на іх фінансаванне. Вядома, што ў студзені 1612 г. навагародскі паборца А. Пачапоўскі збіраў падатак *на поправу Статута* ў адпаведнасці з рашэннем, ухваленым на сойме і рэляцыйным сойміку ў снежні 1611 г. [25, с. 28]. Месцам пасяджэнняў камісіі з 12 сакавіка 1612 г. была абрана Вільня[47]. Па ўказанні Л. Сапегі складаліся вытрымкі з соймавых пастаноў з размеркаваннем іх па тых артыкулах Статута ВКЛ, якія яны тлумачылі ці дапаўнялі. Такім чынам, на думку М. Пергамента і А. Нольдэ, камісія ставіла мэту звесці соймавыя ўхвалы са Статутам ВКЛ, скласці зводны Статут ВКЛ[48]. Праект выдання законаў ВКЛ 13 снежня 1611 г. прадставіў канцлеру Я. Янушоўскі, які ўжо ведаў, што Л. Сапега і *ад іншых пададзенага і гатовага штосьці меў* [34, с. 75; 35, s. 438–439]. Камісія завяршыла сваю работу, пра што дакладваў на надзвычайным сойме 1613 г. А. Пякарскі (гл. арт. 20 соймавых канстытуцый ВКЛ). Неабходнасць разгляду іншых важных пытанняў, якія выносіліся на экстраннае абмеркаванне, стала прычынай рашэння аб перадачы праекта *поправы Статута* на разгляд дэпутацкіх соймікаў, якія павінны былі сабрацца 2 лютага 1614 г. Пасля абмеркавання прапаноўвалася разгледзець і зацвердзіць праект «карэктуры» на бліжэйшым сойме[49] [33, t. III, s. 57].

У 1614 г. было здзейснена і першае выданне Статута ВКЛ 1588 г. на польскай мове, падрыхтоўкай якога (як і наступнага ў 1619 г.), кіраваў Л. Сапега. Аналіз зместу польскамоўнага выдання Статута ВКЛ паказаў, што праўкі камісіі, якая скончыла сваю працу ў 1590-х гг., у яго ўнесены не былі [11, т. I, ч. 2, с. 412–431; 34, s. 75]. Магчыма, іх, як і праўкі 1609–1614 гг., павінны былі прадставіць на разгляд сойма 1615 г., які, аднак, не зацвердзіў увогуле ніводнай канстытуцыі[50] [38].

Перадсоймавыя соймікі Навагародскага павета ВКЛ яшчэ як мінімум двойчы ў першай трэці XVII ст. патрабавалі рэалізацыі «карэктуры законаў». Так соймік, які быў скліканы напярэдадні сойма 1619 г. на 11 снежня 1618 г., даў наказ паслам, каб *карэктура законаў ВКЛ была прыведзена да выканання, а таксама асабліва дамаўляцца і патрабаваць ад паноў пячатараў, каб усе прывілеі, нададзеныя ВКЛ ласкаю каралёў іх міласці і вялікіх князёў літоўскіх за разліццё крыві і працу нашых продкаў* (*vestigiainlucem* – дасл. ‘крокамі ў святле’. – *А. Р.*)*, былі прагледжаны і да друку пададзены*[51] [1, s. 47; 35, s. 440]. У час бескаралеўя 1632–1633 гг. зноў ставілася задача выпраўлення Статута ВКЛ. Напярэдадні канвакацыйнага сойма 1632 г. у інструкцыі паслам змяшчалася патрабаванне, каб *карэктура законаў была даведзена да канца* ці *да эфекту прыйшла паводле старадаўняй эфактацыі*[52]. Аднак і на гэты раз створаная на каранацыйным сойме 1633 г. кадыфікацыйная камісія завяршыла сваю працу безвынікова ў 1636 г.[53] [11, т. I, ч. 2, с. 431–442; 33, t. III, s. 58; 37, s. 161–173].

Такім чынам, лідары палітычна актыўнай сярэдняй і заможнай навагародскай шляхты, сярод якой пераважалі пратэстанты, прымалі непасрэдны актыўны ўдзел у заканатворчай дзейнасці на сойміках, галоўных з'ездах ВКЛ і соймах, а таксама ў працы па сістэматызацыі права і заканадаўства. Калі для трох паветаў Навагародскага ваяводства ў складзе кадыфікацыйных камісій рэзервавалася толькі адно месца, яго займаў прадстаўнік шляхты Навагародскага павета. Нягледзячы на беспаспяховасць спроб соймавых камісій у першай трэці XVII ст. падрыхтаваць тэкст новай рэдакцыі Статута ВКЛ, якая б атрымала санкцыю сойма, пэўныя змены і дапаўненні ў яго артыкулы ўносіліся пас-

[44] *Radziwiłł A. S.* Pamiętnik o dziejach w Polsce (1632–1656) : w 3 t. / wyd. A. Przyboś, R. Żelewski. T. I. 1632–1636. Warszawa : PIW, 1980. S. 516.
[45] Мог быць дэпутаваны ў склад камісіі Мсціслаўскім ці Менскім ваяводствам.
[46] Urzędnicy WKsL: spisy. T. I. Województwo wileńskie: XIV–XVIII wiek / oprac. H. Lulewicz [i in.]. 2004. № 2792. S. 386; T. III. № 635. S. 164.
[47] VC. T. III. Vol. 1. S. 39.
[48] Обозрение исторических сведений о составлении Свода местных законов Западных губерний. СПб. : М.Я. Пергамент, А.Э. Нольде, 1910. С. 60–61.
[49] VC. T. III. Vol. 1. S. 147.
[50] VC. T. III. Vol. 1. S. 191.
[51] AGAD. AR. Dz. II. № 701. S. 4, 12.
[52] AGAD. AR. Dz. II. № 1089. S. 6; РНБ. Ф. 971. Оп. 1. Авт. 126. Л. 54 об. (56 об.).
[53] VC. T. III. 1611–1640. Vol. 2. 1627–1640. / przegotow. do druku S. Grodziski, M. Kwiecień, A. Karabowicz ; przedm. W. Uruszczak. Warszawa: Wydaw. Sejm., 2013. S. 206, 273; Radziwiłł A. S. Pamiętnik o dziejach w Polsce (1632–1656) : w 3 t. / wyd. A. Przyboś, R. Żelewski. T. I. 1632–1636. Warszawa : PIW, 1980. S. 313–315, 319, 514, 516, 521–526, 531–536.

ля апаведных ухвал, якія прымаліся на сойміках ВКЛ і соймах. Павятовыя соймікі Новагародскага і Слонімскага паветаў неаднаразова карысталіся правам заканадаўчай ініцыятывы і прапаноўвалі ўносіць змены ў статутным заканадаўстве, якія станавіліся нормамі соймавых канстытуцый.

## Бібліяграфічныя спасылкі

1. *Zakrzewski A. B.* O kulturze prawnej Wielkiego Księstwa Litewskiego XVI–XVIII wieku – uwagi wstępne // Kultura i języki Wielkiego Księstwa Litewskiego / red. M. T. Lizisowa. Kraków, 2005. S. 33–63.

2. *Zakrzewski A. B.* Statuty Litewskie – zasady a praktyka stosowania // Lietuvos Didžiosios Kunigaikštystės istorijos atodangos. Profesoriaus Mečislovo Jučo 90-mečio jubiliejui skirtas mokslinių straipsnių rinkinys / sud. V. Dolinskas, et al. Vilnius : Nac. musiejus Liet. Didziosios Kunigaikstystes valdovu rumai, 2016. P. 279–291.

3. *Lulewicz H.* Gniewów o unię ciąg dalszy. Stosunki polsko-litewskie w latach 1569–1588. Warszawa : Neriton, 2002.

4. *Kieniewicz L.* Senat za Stefana Batorego. Warszawa : Wydaw. Sejm., 2000.

5. *Ferenc M.* Mikołaj Radziwiłł «Rudy» (ok. 1515–1584): działalność polityczna i wojskowa. Kraków : Historia Iagell., 2008.

6. *Подолинский В.* Великое княжество Литовское в системе представительных органов власти Речи Посполитой: обособленные формы парламентской деятельности в последней трети XVI в. // Парламентаризм в Республике Беларусь: опыт становления и развития : сб. науч. ст. / ред. В. А. Божанов. Минск, 2006. С. 52–62.

7. *Радаман А.* Інструкцыя новагародскага сойміка паслам на элекцыйны сойм 1587 г. // Беларус. гіст. агляд. 2003. Т. 10, сш. 1–2 (18–19). С. 163–174.

8. *Czwołek A.* Piórem i buławą. Działalność polityczna Lwa Sapiehy, kanclerza litewskiego, wojewody wileńskiego. Toruń : Wydaw. Naukowe Uniw. Mikołaja Kopernika, 2012.

9. *Радаман А.* Кліенты і«прыяцелі» Астафея Багданавіча Валовіча ў Навагрaдскім павеце ВКЛ у 1565–1587 гг. // Unus pro omnibus: Валовічы ў гісторыі Вялікага Княства Літоўскага XV–XVIII стст. / навук. рэд. А. І. Шаланда. Мінск, 2014. С. 284–296.

10. *Радаман А.* Род Харытановічаў Вобрынскіх (Абрынскіх) уласнага герба «Харытон» у Новагародскім павеце ў другой палове XVI ст. // Карэліччына: людзі, падзеі, час : зб. навук. арт. / уклад. А. А. Скеп'ян [і інш.] ; рэдкал. А. А. Каваленя [і інш.]. Мінск, 2012. С. 50–63.

11. *Лаппо И.* Литовский Статут 1588 года = Lappo J. 1588 metų Lietuvos Statutas : в 2 т., 3 кн. Kaunas : «Spindulio» B-vės spaustuvė, 1934–1938. Т. 1 : Исследование. Ч. 1. 1934 ; Ч. 2. 1936; Т. 2 : Текст. 1938.

12. *Пташицкий С.* К истории Литовского права после третьего статута. СПб. : Тип. В. С. Балашева и К°, 1893.

13. *Bardach J.* Zatwierdzenie III Statutu litewskiego przez Zygmunta III Wazę // Czas. Prawno-Historyczne. 1978. T. XXX, zesz. 2. S. 39–51.

14. *Bardach J.* Statuty litewskie w ich kręgu prawno-kulturowym // O dawnej i niedawnej Litwie. Poznań, 1988. S. 9–71.

15. *Wisner H.* Z dziejów zatwierdzenia III Statutu Wielkiego Księstwa Litewskiego // Czas. Prawno-Historyczne. 1983. T. XXXV, zesz. 1. S. 213–220.

16. *Бершадский С.* Литовский Статут и Польские Конституции : ист.-юрид. исслед. СПб. : Тип. М. Стасюлевича, 1893.

17. *Пташицкий С.* К вопросу об изданиях и комментариях Литовского Статута. Историко-библиографическая справка. СПб. : Тип. С. А. Корнатовского, 1893.

18. *Мякишев В.* Кириллические издания Литовского Статута 1588 г. Kraków : Lexis, 2014.

19. *Bednarski Ł.* Statuty Wielkiego Księstwa Litewskiego // Prz. Wschod.-eur. 2012. № 3. S. 29–40.

20. *Godek S.* Elementy prawa rzymskiego w III Statucie litewskim (1588). Warszawa : Oficyna Naukowa, 2004.

21. *Ptaszycki S.* Konfederacja Warszawska roku 1573 w trzecim Statucie Litewskim // Księga pamiątkowa ku uczczeniu czterechsetnej rocznicy wydania Pierwszego Statutu Litewskiego / red. S. Ehrenkreutz. Wilno, 1935. S. 185–213.

22. *Zakrzewski A. B.* Wielkie Księstwo Litewskie (XVI–XVIII w.). Prawo – ustrój – społeczeństwo. Podkowa Leśna : Wydaw. Campidoglio Marcin Trepczyński, 2013.

23. *Zakrzewski A. B.* Zakaz, którego nie było: o rzekomym zakazie drukowania III Statutu w języku oryginału i kilku innych wątpliwościach // Stud. z Dziejów Państwa i Prawa Polskiego, 2006. T. 9. S. 227–237.

24. *Лойка П.* Шляхта беларускіх зямель у грамадска-палітычным жыцці Рэчы Паспалітай другой паловы XVI – першай трэці XVII ст. Мінск : БДУ, 2002.

25. *Радаман А.* Ухваленне мясцовых падаткаў на сойміках і шляхецкіх з'ездах Новагародскага ваяводства ВКЛ у другой палове XVI – пачатку XVII ст. // Беларус. гіст. часоп. 2013. № 9. С. 22–33.

26. *Raudeliunas V.* Treciojo Lietuvos Statuto pataisos (XVI a. pab.) // Teisinių institutų raida Lietuvoje XIV–XIX / red. P. Dičius, et al. Vilnius, 1981. P. 129–141.

27. *Радаман А.* Новагародскі перадсоймавы соймік 19–21 студзеня 1598 г. // Людзі і ўлада Навагрудчыны: гісторыя ўзаемадзеяння (да 500-годдзя надання Навагрудку прывілея на магдэбургскае права) : зб. навук. арт. / уклад. А. Скеп'ян [і інш.] ; рэдкал. А. Каваленя [і інш.]. Мінск, 2013. С. 139–162.

28. *Свяжынскі У.* «Гістарычныя запіскі» Ф. Еўлашоўскага. Мінск : Навука і тэхніка, 1990.

29. *Radaman A.* Samorząd sejmikowy w powiatach województwa nowogródzkiego Wielkiego Księstwa Litewskiego w latach 1565–1632 // Praktyka życia publicznego w Rzeczypospolitej Obojga Narodów w XVI–XVIII wieku / red. U. Augustyniak, A. B. Zakrzewski. Warszawa, 2010.

30. *Радаман А.* Павятовыя соймікі Новагародскага ваяводства Вялікага Княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага напярэдадні кракаўскага ардынарнага сойма Рэчы Паспалітай абодвух народаў 1603 г. // Вялікае Княства Літоўскае: палітыка, эканоміка, культура : зб. навук. арт : у 2 ч. / уклад.: А. А. Скеп'ян ; рэдкал.: У. Р. Гусакоў [і інш.]. Мінск, 2017. Ч. 1. С. 221–252.

31. Polski Słownik Biograficzny. T. I–LI. Poznań ; Kraków ; Warszawa ; Wrocław, 1935–2017.

32. *Рыбчонак С.* Паходжанне і радавод Валовічаў XV – пачатку XVII ст. // Unus pro omnibus: Валовічы ў гісторыі Вялікага княства Літоўскага XV–XVIII стст. / навук. рэд. А. Шаланда. Мінск, 2014. С. 15–107.

33. *Wisner H.* Rzeczpospolita Wazów : w 3 t. Warszawa : Neriton, 2002–2008. T. I : Czasy Zygmunta III i Władysława IV. 2002 ; T. II : Wojsko Wielkiego Księstwa Litewskiego, dyplomacja, varia. 2004 ; T. III : Sławne państwo – Wielkie Księstwo Litewskie. 2008.
34. *Zakrzewski A.* Lew Sapieha a kodyfikacja prawa litewskiego // Леў Сапега (1557–1633 гг.) i яго час. Гродна, 2007. С. 73–79.
35. *Zakrzewski A. B.* Oferta Jana Januszowskiego wobec Lwa Sapiehy, czyli nieznany projekt wydania praw i prywilejów litewskich z 1611 roku // Prawo wczoraj i dziś. Studia dedykowane profesor Katarzynie Sójce-Zielińskiej / red. G. Bałtruszajtys. Warszawa, 2000. S. 435–446.
36. *Ochmann S.* Sejmy z lat 1615–1616. Wrocław: Zakład Nar. im. Ossolińskich, 1970.
37. *Kaczorowski W.* Korektura prawa na sejmach okresu bezkrólewia 1632 roku oraz na sejmie koronacyjnym 1633 roku // Acta Universitatis Wratislaviensis. No. 3270. Prawo CCCXI. Wrocław, 2010. S. 161–173.
38. *Дружчыц В.* Палажэньне Літоўска-Беларускай дзяржавы пасьля Люблінскай вуніі // Пр. Беларус. дзярж. ун-та. 1925. № 6–7. С. 216–251.

## References

1. Zakrzewski A. B. O kulturze prawnej Wielkiego Księstwa Litewskiego XVI–XVIII wieku – uwagi wstępne. In: *Kultura i języki Wielkiego Księstwa Litewskiego*. Kraków, 2005. P. 33–63 (in Pol.).
2. Zakrzewski A. B. Statuty Litewskie – zasady a praktyka stosowania. In: *Lietuvos Didžiosios Kunigaikštystės istorijos atodangos. Profesoriaus Mečislovo Jučo 90-mečio jubiliejui skirtas mokslinių straipsnių rinkinys*. Vilnius : Nac. musiejus Liet. Didziosios Kunigaikstystes valdovu rumai, 2016. P. 279–291 (in Pol.).
3. Lulewicz H. Gniewów o unię ciąg dalszy. Stosunki polsko-litewskie w latach 1569–1588. Warszawa : Neriton, 2002 (in Pol.).
4. Kieniewicz L. Senat za Stefana Batorego. Warszawa : Wydaw. Sejm., 2000 (in Pol.).
5. Ferenc M. Mikołaj Radziwiłł «Rudy» (ok. 1515–1584) : działalność polityczna i wojskowa. Kraków : Historia Iagell., 2008 (in Pol.).
6. Podolinsky V. [The Grand Duchy of Lithuania in the system of representative authorities of Rzeczpospolita: isolated forms of parliamentary activity in the last third of the XVI century]. In: *Parlamentarizm v Respublike Belarus': opyt stanovleniya i razvitiya* [Parliamentarism in the Republic of Belarus: the experience of formation and development]. Minsk, 2006. P. 52–62 (in Russ.).
7. Radaman A. [The instruction of Novaharodak local diet for its deputies to the 1587 election Sojm]. *Belarus. gistarychny agljad* [Belarus. Hist. Rev.]. 2003. Vol. 10, fasc. 1–2 (18–19). P. 163–174 (in Belarus.).
8. Czwołek A. Piórem i buławą. Działalność polityczna Lwa Sapiehy, kanclerza litewskiego, wojewody wileńskiego. Toruń : Wydaw. Naukowe Uniw. Mikołaja Kopernika, 2012 (in Pol.).
9. Radaman A. [Astafey Bogdanovich Volovich's Customers and «Buddies» in Novohorodok county in 1565–1587]. In: *Unusproomnibus: Valovichy w gistoryi Vjalikaga Knjastva Litowskaga XV–XVIII stst.* [Unus pro omnibus: Family name Wołłowicz in the history of the Grand Duchy of Lithuania]. Minsk, 2014. P. 284–296 (in Belarus.).
10. Radaman A. [Family name Charitonovič Obrinskij, own emblem «Chariton» [«Khariton»] in Novohorodok county in the second half of the XVI century]. In: *Karjelichchyna: ljudzi, padzei, chas* [Karelichchine: people, events, time] : collect. of sci. articles. Minsk, 2012. P. 50–63 (in Belarus.).
11. Lappo I. Litovskii Statut 1588 goda = 1588 metų Lietuvos Statutas [The Lithuanian Statute of 1588] : in 2 vols, 3 books. Kaunas, 1934–1938. Vol. 1. [A study]. Part. 1. 1934 ; Part. 2. Kaunas : «Spindulio» B-vės spaustuvė, 1936; Vol. 2. [Text], 1938 (in Russ.).
12. Ptashickij S. K istorii Litovskogo prava posle tret'ego statuta [To the History of Lithuanian Law after the Third Statute]. Saint Petersburg : Print. House by V. S. Balashev & C˚, 1893 (in Russ.).
13. Bardach J. Zatwierdzenie III Statutu litewskiego przez Zygmunta III Wazę. *Czas. Prawno-Historyczne.* 1978. T. XXX, zesz. 2. P. 39–51 (in Pol.).
14. Bardach J. Statuty litewskie w ich kręgu prawno-kulturowym. In: *O dawnej I niedawnej Litwie*. Poznań, 1988. P. 9–71 (in Pol.).
15. Wisner H. Z dziejów zatwierdzenia III Statutu Wielkiego Księstwa Litewskiego. *Czas. Prawno-Historyczne.* 1983. T. XXXV, zesz. 1. P. 213–220 (in Pol.).
16. Bershadskii S. Litovskii Statut I Pol'skie Konstitutsii [The Lithuanian Statute and the Polish Constitutions] : hist. and leg. res. Saint-Petersburg, 1893 (in Russ.).
17. Ptashickij S. K voprosu ob izdaniyakh i kommentariyakh Litovskogo Statuta. Istoriko-bibliograficheskaya spravka [On the question of the publication and the comments of the Lithuanian Statute. Historical and bibliographic reference]. Saint Petersburg : Publ. house by S. A. Korontovskii, 1893 (in Russ.).
18. Myakishev V. Kirillicheskie izdaniya Litovskogo Statuta 1588 goda. [Cyrillic edition of the Lithuanian Statute of 1588]. Kraków : Lexis, 2014 (in Russ.).
19. Bednarski Ł. Statuty Wielkiego Księstwa Litewskiego. *Prz. Wschod.-eur.* 2012. No. 3. S. 29–40 (in Pol.).
20. Godek S. Elementy prawa rzymskiego w III Statucie litewskim (1588). Warszawa : Oficyna Naukowa, 2004 (in Pol.).
21.Ptaszycki S. Konfederacja Warszawska roku 1573 w trzecim Statucie Litewskim. In: *Księga pamiątkowa ku uczczeniu czterechsetnej rocznicy wydania Pierwszego Statutu Litewskiego*. Wilno, 1935. P. 185–213 (in Pol.).
22. Zakrzewski A. B. Wielkie Księstwo Litewskie (XVI–XVIII w.). Prawo – ustrój – społeczeństwo. Podkowa Leśna : Wydaw. Campidoglio Marcin Trepczyński, 2013 (in Pol.).
23. Zakrzewski A. B. Zakaz, którego nie było : o rzekomym zakazie drukowania III Statutu w języku oryginału i kilku innych wątpliwościach. *Stud. z Dziejów Państwa I Prawa Polskiego*. 2006. Vol. 9. P. 227–237 (in Pol.).
24. Lojka P. Shljahta belaruskih zjamel' u gramadska-palitychnym zhycci Rjechy Paspalitaj drugoj palovy XVI – pershaj trjeci XVII st. [Gentry Belarusian lands in the socio-political life of Rzeczpospolita the second half of XVI – the first third of the XVII century]. Minsk : BSU, 2002 (in Belarus.).

25. Radaman A. Uhvalenne mjascovyh padatkaw na sojmikah i shljaheckih z'ezdah Novagarodskaga vajavodstva VKL u drugoj palove XVI – pachatku XVII st. *Belarus. gistarychny chasopis* [Belarus. hist. J.]. 2013. No. 9. P. 22–33 (in Belarus.).
26. Raudeliunas V. Treciojo Lietuvos Statuto pataisos (XVI a. pab.). In: *Teisinių institutų raida Lietuvoje XIV–XIX*. Vilnius, 1981. P. 129–141 (in Lith.).
27. Radaman A. [Pre-diet Dietine in the Novogorodok County, 19–21 January 1598]. In: *Ljudzi i wlada Navagrudchyny: gistoryja ŭzaemadzejannja (da 500-goddzja nadannja Navagrudku pryvileja na magdeburgskae prava)* [People and authorities of Navagrudak Land: history of interaction (to the 500th anniversary of Novogrudok giving privileges on Magdeburg Law]. Minsk, 2013. P. 139–162 (in Belarus.).
28. Svyazhynski U. «Gistarychnyja zapiski» Fjodara Jewlashowskaga [Fyodor Evlashovsky's «Historical Records». Minsk : Navuka I technika, 1990 (in Belarus.).
29. Radaman A. Samorząd sejmikowy w powiatach województwa nowogródzkiego Wielkiego Księstwa Litewskiego w latach 1565–1632. In: *Praktyka życia publicznego w Rzeczypospolitej Obojga Narodów w XVI–XVIII wieku*. Warszawa, 2010 (in Pol.).
30. Radaman A. [County Dietines of the Novohorodok province of the Grand Duchy of Lithuania, Rus' and Samogitia on the eve the Cracow Ordinary Diet (Sejm) of the Commonwealth of the Both Nations in 1603]. In: *Vjalikae Knjastva Litowskae: palityka, ekanomika, kul'tura* [The Grand Duchy of Lithuania: politics, economy, culture]. Minsk, 2017. Part 1. P. 221–252 (in Belarus., in old Belarus., in Pol.).
31. Polski Słownik Biograficzny [Polish Biographical Dictionary]. Vol. I–LI. Poznań; Kraków ; Warszawa ; Wrocław, 1935–2017 (in Pol.).
32. Rybchonak S. [The origin and ancestry Family name Volovich XV – early XVII century]. In: *Unus pro omnibus: Valovichy w gistoryi Vjalikaga Knjastva Litowskaga XV–XVIII stst*. [Unus pro omnibus: Family name Volovich in the history of the Grand Duchy of Lithuania]. Minsk, 2014. P. 15–107 (in Belarus.).
33. Wisner H. Rzeczpospolita Wazów : w 3 t. Warszawa : Neriton, 2002–2008. T. I : Czasy Zygmunta III i Władysława IV. 2002 ; T. II : Wojsko Wielkiego Księstwa Litewskiego, dyplomacja, varia. 2004 ; T. III : Sławne państwo – Wielkie Księstwo Litewskie. 2008 (in Pol.).
34. Zakrzewski A. B. Lew Sapieha a kodyfikacja prawa litewskiego. In: *Lew Sapieha (1557–1633) i jago chas*. Grodna, 2007. P. 73–79 (in Pol.).
35. Zakrzewski A. B. Oferta Jana Januszowskiego wobec Lwa Sapiehy, czyli nieznany projekt wydania praw i prywilejów litewskich z 1611 roku. In: *Prawo wczoraj i dziś. Studia dedykowane profesor Katarzynie Sójce-Zielińskiej*. Warszawa, 2000. P. 435–446 (in Pol.).
36. Ochmann S. Sejmy z lat 1615–1616. Wrocław : Zakład Nar. im. Ossolińskich, 1970 (in Pol.).
37. Kaczorowski W. Korektura prawa na sejmach okresu bezkrólewia 1632 roku oraz na sejmie koronacyjnym 1633 roku. In: *Acta Universitatis Wratislaviensis*. No. 3270. Prawo. Vol. CCCXI. Wrocław, 2010. P. 161–173 (in Pol.).
38. Druzhchyc V. [The status of the Lithuanian-Belarusian state after Lublin union]. *Pracy Belaruskaga dzjarzhawnaga wniversiteta* [Scientific works of the Belarusian State University]. 1925. No. 6–7. P. 216–251 (in Belarus.).

*Артыкул паступіў у рэдкалегію 05.02.2018.*
*Received by editorial board 05.02.2018.*